Ігуменскі тракт

№ 1 (59)

■ Выставы

«Крохкія ўспаміны»

Напярэдадні Новага года ў цэнтральнай бібліятэцы г. Жодзіна адкрылася выстава савецкіх ёлачных цацак, арганізатарам якой удалося ўзнавіць атмасферу мінулага. Старыя паштоўкі і газеты, шары з савецкай сімволікай і выявамі правадыроў пралетарыяту, фігуркі касманаўтаў, цацкі з ваты…

— Людзі з ахвотай перадавалі нам свае крохкія ўспаміны, засмучаліся, што многае пабілася ці згубілася, — кажа ідэйны арганізатар выставы мастачка Алена Пятроўская. — Аднак тыя, хто даваў нам цацкі толькі на час выставы, потым, пабываўшы на ёй, вырашылі зрабіць падарунак… Бо гэта сапраўдная прыгажосць, якая павінна радаваць іншых.

Сама цацка, паводле слоў Алены Аляксандраўны, рэч унікальная. Па ёй, напрыклад, людзі могуць прасачыць гісторыю нашай краіны. Напрыклад, як зорка з каляднай ператварылася ў савецкую? Васьміканцовую Віфлеемскую памянялі на пяціканцовую, анёлаў — на піянераў і чырвонаармейцаў, потым яшчэ і на ёлачных цацках з'явіліся серп і молат, хрушчоўская кукуруза, касманаўты, спадарожнік «Мір»…

Усё гэта і шмат чаго іншага да канца студзеня можна ўбачыць на выставе «Крохкія ўспаміны».

Віталь ЖУРАЎСКІ

ЦУКАР, ЯКІ МАЦУЕ
І КАЛДУНЫ З ПАЛЯНДВІЦЫ І БАРАНІНЫ:
гастранамічная спадчына Мельхіёра Ваньковіча

БАЙКІ кухмістра ВЕРАШЧАКІ

Так ужо склалася, што сярэднестатыстычны сучасны беларус пра жыццё ў Заходняй Беларусі ведае нямнога. Зразумела, у міжваеннай Рэчы Паспалітай жылося няпроста, аднак карціна таго жыцця не зводзіцца цалкам да палітычных і нацыянальных рэпрэсій. Большасць людзей цяжка працавала, спрабавала зарабіць нейкую лішнюю залатоўку, набыць патрэбнае для дзяцей, паглядзець новае кіно, патанцаваць пасля цяжкой працы. Бо жыццё ў сваёй аснове заўжды аднолькавае — каму-каму, а Кухмістру гэта бачна лепш за іншых.

Дык вось, жылі неяк нашы людзі і пры Пілсудскім. Большасць, сапраўды, нялёгка. Гаспадарка цяжка аднаўлялася пасля ваеннай разрухі. З аднаго боку — Савецкі Саюз, з другога — Захад, які зладзіў амаль што эканамічную блакаду. А калі ў канцы 1920-х надышла Вялікая дэпрэсія, зрабілася зусім цяжка. Экспартаваць адноўленая дзяржава магла мала што. Напрыклад, цукар. Вось яго і спрабавалі прадаваць за мяжу, каб неяк звесці канцы з канцамі. Але заходнія капіталісты людзі жорсткія, асабліва ў цяжкія часы. Дык яны так збілі цэны на той цукар, так выкруцілі рукі экспарцёрам, што польскі цукар, у тым ліку і выраблены з беларускіх буракоў, прадаваўся ў Англіі за 17 тагачасных польскіх грошаў за кілаграм, хаця на радзіме каштаваў ажно 1 злоты 55 грошаў. Бо высокія былі акцызы на цукар, якія давалі польскай дзяржаве больш грошай, чым каштавала будаўніцтва ўсіх дарог. І за гэтыя ж грошы аплачваўся дэмпінгавы экспарт цукру на

Цукар мацуе.

Захад. Кажуць, што кемлівыя англійскія фермеры пачалі нават карміць польскім цукрам… свінняў, так што нават гэта збіла цэны на англійскі бекон і яшчэ больш ускладніла эканамічнае становішча Польшчы, якая таксама той бекон экспартавала. Такія вось эканамічныя парадоксы. Так, часам «эфектыўныя менеджары» дураць саміх сябе і сваю краіну.

Але нічога лепшага прыдумаць не змаглі, як наладзіць масіраваную рэкламу цукру дома. І даручылі вядомаму публіцысту (а па сумяшчальніцтве — капірайтару) Мельхіёру Ваньковічу вынайсці магічную формулу, якая прымусіла б спажыўца купляць больш цукру.

Мельхіёр Ваньковіч, трэба адзначыць, наш зямляк. На жаль, дагэтуль на Беларусі амаль невядомы. Ён нарадзіўся 10 студзеня 1892 года ў маёнтку Калюжыцы (сучасны Бярэзінскі раён), у тым самым маёнтку і той самай сям'і, дзе стагоддзем раней нарадзіўся вядомы мінскі мастак Валентый Ваньковіч. Яшчэ да Другой сусветнай вайны Мельхіёр Ваньковіч праславіўся як «кароль польскага рэпартажу», а яго праца ваеннага карэспандэнта пры арміі генерала Андэрса яшчэ больш узмацніла гэтую славу. Ваньковіч пражыў доўгае, нялёгкае і слаўнае жыццё (памёр у 1974 годзе), у якім знайшлося месца і эміграцкім бадзянням, і зняволенню ў ПНРаўскай турме за незалежную інтэлектуальную пазіцыю. Дарэчы, незадоўга да смерці ён стварыў яшчэ адзін «хітовы» рэкламны слоган, для авіякампаніі LOT: «LOTам — бліжэй». Яго кнігі «Шчанячыя гады», «Аповесць пра бітву за Монтэ-Касіна», «Зёлкі на кратары», «Туды-сюды», у якіх шмат месца адведзена і страчаным рэаліям Беларусі, зрабіліся класікай польскай літаратуры XX стагоддзя і ў значнай ступені «расцяганы» на цытаты — мудрыя, часам прыкрыя і саркастычныя.

Дык вось, у 1931 годзе для цукровых заводчыкаў ён стварыў рэкламны слоган усяго з двух слоў: «Cukier krzepi!» (Цукар мацуе). Была праведзена маштабная рэкламная кампанія ў прэсе, праз постары ў крамах і іншае, якая заклікала купляць больш цукру, бо ён быццам бы карысны для здароўя, асабліва для дзетак. І косці ад яго нібы мацнеюць і растуць хутчэй. Усяго было створана некалькі дзясяткаў відаў рэкламных плакатаў, якія апелявалі пераважна да жанчын. І на нейкі час сітуацыя з продажам цукру істотна палепшылася, бо якая ж маці пашкадуе неабходнага для свайго дзіцяці? Ганарар, які выплацілі Ваньковічу за гэтыя 2 словы, склаў рэкордныя 5000 злотых. Тагачасны месячны заробак прэзідэнта Рэчы Паспалітай складаў 3000 злотых, а заробак настаўніка — 300 злотых. А за 2 словы столькі наўрад ці зараблялі і лепшыя заходнія капірайтары тых часоў. Можна сказаць, што гэтыя постары ў значнай ступені сфарміравалі сімвалічную, эстэтычную атмасферу міжваеннай Польшчы, у тым ліку і Заходняй Беларусі. Дагэтуль вынайдзеная Ваньковічам «магічная формула» застаецца самай вядомай у гісторыі польскага рэкламнага бізнесу. А створаная, лічыце, мінчанінам.

Выхаваны ў атмасферы шляхецкіх фальваркаў сярэдняй заможнасці, Ваньковіч выдатна ведаў традыцыйную «ліцвінскую» кухню. Спадзяюся, у гэтай рубрыцы яшчэ не раз згадаем пана Мельхіёра добрым словам. Некаторыя з зафіксаваных ім рэцэптаў увайшлі ў гісторыю, як і яго рэкламныя слоганы і афарызмы.

Калдуны Мельхіёра Ваньковіча

Складнікі: *Для цеста — 2 шклянкі мукі, 2/3 шклянкі вады, соль.*

Для начынкі *— 200 г ялавічнай паляндвіцы, 200 г барановага лою, 200 г бараніны (сцягно), 2–3 лыжкі булёну, трохі цукру, солі, маярану, часнаку.*

Для варкі *— 2 л булёну (можна з кубікаў); 80 г вяршковага масла.*

Прыгатаванне: З мукі і падсоленай вады (кіпеню, што астыў) замясіць эластычнае цеста. (Ідэальна — мясіць на працягу 30 хвілін). Выбіць аб стальніцу з усіх бакоў. Прыкрыць сурвэткай і пакінуць на 30 хвілін.

Мяса старанна ачысціць ад абалонак. Лой паставіць на 20 хвілін у маразільнік, каб зацвярдзеў. Бараніну і паляндвіцу нарэзаць дробнымі кубікамі і пасячы цесаком, лой настругаць нажом на тонкія пласцінкі. Перамяшаць мяса, лой, прыправы, дадаць трохі булёну, добра перамяшаць. Цеста, па порцыях, раскачваць у пласт таўшчынёй ільнянога палатна. Раскладаць шэрагамі «кулькі» з фаршу на адным пласце цеста, накрываць другім, абціскаючы пальцамі вакол «кулёк», вырэзаць калдуны кілішкам для гарэлкі. Укладаць калдуны ў кіпячы падсолены булён невялічкімі партыямі, каб маглі ўсплыць адным слоем. Пасля ўсплывання варыць 3–5 хвілін, затым — наступную партыю і г. д.

На дно паўміскі пакласці некалькі кавалкаў масла (нерастопленага), затым па чарзе партыі калдуноў, перакладаючы наступнымі кавалкамі масла. Есці лыжкай з глыбокіх талерак або місак. Можна пасыпаць зяленівам.

Цытаты М. Ваньковіча:

«Больш карысна мець прэтэнзіі да сябе самога, чым да іншых»

«Няма нічога больш ненадзейнага, чым лічба»

«Жанчына ўпарта верыць у тое, што мужчына зменіцца, і ў тое, што сама яна не змяняецца»

«Мама — гэта мяккія рукі. Мама — гэта меладычны голас, подых на выцятае месца. Мама — гэта само дабро і прыемнасць, нешта, што хочацца мець у кожную хвіліну жыцця побач з сабой, вакол сябе, недзе ўдалечыні. Але адначасова мама — гэта і строгія правілы, няўмольныя «ідзі спаць», жахлівыя «апрані гэта, калі ласка». Мама — расціранне шорсткім ручніком, адмераныя гадзіны, жыццё прыемнае, зычлівае, сонечнае, але без сюрпрызаў і вельмі святое.

■ Брэнд краіны

«І ТЧЭ, ЗАБЫЎШЫСЯ, РУКА…»

Было некалькі памылак, звязаных з ткацтвам. Але тым, хто іх зрабіў, можна дараваць. Першая — Максіма Багдановіча, які ў вершы «Слуцкія ткачыхі» апісаў жанчын, хаця ткацтва насамрэч было справай цяжкой і таму выключна мужчынскай. Другую зрабіў мастак Міхаіл Блішч, які на сваім палатне намаляваў таксама жанчын, дапусціўшы такую ж памылку, як і паэт. Аднак і яму можна дараваць, бо карціна атрымалася ўдалай, наскрозь пранізаным прыгожым святлом і зззяннем залатых і срэбных нітак. Была і трэцяя недарэчнасць: у Слуцкім краязнаўчым музеі дагэтуль не было ніводнага ўласнага слуцкага пояса. З гэтым вырашылі не мірыцца, і, аб'яднаўшыся, напрыканцы мінулага года случчане набылі ў калекцыю свайго горада аўтэнтычны слуцкі пояс.

Набыты слуцкі пояс.

Дырэктар Слуцкага краязнаўчага музея Наталля СЕРЫК расказала, што інфармацыю пра тое, што ў беларускага прыватнага калекцыянера ёсць слуцкі пояс і ён жадае яго прадаць, ім паведаміў адзін з мінскіх музейных супрацоўнікаў. Случчане не маглі абыякава паставіцца да такой навіны, адразу звярнуліся ў мясцовы райвыканкам, дзе таксама станоўча ўспрынялі гэту звестку і вырашылі, што трэба дзейнічаць. Быў абвешчаны збор сродкаў на набыццё слуцкага пояса.

Неабыякавых да гэтай справы людзей аказалася даволі многа. Усе мясцовыя прадпрыемствы пералічылі сродкі. Асаблівую дапамогу аказаў Слуцкі цукрарафінадны камбінат. Мясцовыя ўстановы адукацыі, хоць і з'яўляюцца дзяржаўнымі ўстановамі, таксама ахвяравалі грошы. Пералічвалі свае фінансы і звычайныя людзі. У кагосьці гэта было 20 тысяч, у кагосьці 3 мільёны — галоўнае, дапамагчы зрабіць добрую справу. Сярод гарадоў, якія падтрымалі Слуцк, былі Мінск, Жодзіна, Гомель, Салігорск.

Набыты пояс быў вытканы ў Слуцку пры Яну Маджарскім прыкладна 300 гадоў таму. Час яго вытворчасці адносяць да 1762–1780 гадоў. Ён чатырохбаковы і мае два асноўныя адценні — зялёнае і чырвонае. Пояс знаходзіўся ва ўжытку, аднак да нашага часу захаваўся даволі добра. Знешне ён абсалютна цэлы, хаця экспертыза, якая праводзілася ў Нацыянальным мастацкім музеі, паказала, што насамрэч ён сшыты — хоць заўважыць гэта амаль немагчыма. Пояс вытканы з шаўковай, сярэбранай і сярэбранай пазалочанай («залатой») ніткі. На ім зроблены тыповыя раслінныя матывы пнёў, якія «цвітуць». На адным канцы пояса выткана двухбаковая метка «SLUCK».

Гэты выраб стаў 6-м слуцкім поясам у Беларусі.

Наталля Серык адзначае, што самі случчане вельмі рады такому набыццю і ставяцца да гэтага як сапраўдныя патрыёты. Калісьці аналагічны пояс прывезлі сюды на экспанаванне на ноч музеяў, якая праводзілася тут упершыню. Нягледзячы на дрэннае надвор'е, расказвае Наталля Серык, народу сабралася надзвычай шмат. Такі самы ажыятаж выклікала і Слуцкае Евангелле, якое прывезлі ў наступны раз. Таму ўласны набыты рарытэт, мяркуе дырэктар, будзе карыстацца вялікай цікавасцю наведвальнікаў.

Дырэктар Слуцкага краязнаўчага музея Наталля СЕРЫК.

З гісторыі

У 1736 годзе браты Радзівілы заснавалі ў прыгарадзе Нясвіжа мануфактуру (ці, па-тагачаснаму, персіярню), якая затым «пераехала» ў Слуцк. Для працы на ёй запрасілі самых выдатных майстроў з Турцыі і Персіі. Але неўзабаве князь накіраваў мясцовых маладых рабочых Я. Гадоўскага і Т. Хаецкага ў Станіслаў для навучання (у той час Станіслаў славіўся вытворчасцю паясоў). Менавіта адтуль было завезена і абсталяванне для фабрыкі — некалькі ткацкіх станкоў. Пазней на фабрыку прыйшлі мясцовыя майстры. Да нашых дзён дайшлі іх прозвішчы — Іосіф Барсук, Міхаіл Баранцэвіч, Лойка, Канчыла і іншыя.

Росквіт слуцкай персіярні прыпадае на 1760–1770 гады, калі ёю кіраваў знакаміты майстар Аванэс Маджаранц (на мясцовы манер — Ян Маджарскі). Створаны пры ім тып пояса атрымаў назву «слуцкі», якая стала сінонімам усіх доўгіх шаўковых паясоў, дзе б яны ні вырабляліся. Паясы ткаліся з шаўковых, срэбных і залатых нітак. Даўжыня іх была ад 2 да 4 метраў, шырыня — 20–40 сантыметраў. Паясы ўпрыгожваліся шыкоўным арнаментам: поле звычайна запаўнялася папярэчнымі палоскамі альбо лускавым малюнкам, канцы — гірляндамі з кветак і лісця. Сустракаліся вырабы, канцы каторых абшываліся махрамі. На абодвух канцах пояса была метка на лацінскай мове ці на кірыліцы: «Мяне зрабілі ў Слуцку», «Слуцк», «Во градзе Слуцке».

Набыты слуцкі пояс будзе два месяцы знаходзіцца ў асобнай экспазіцыі. Таму кожны ахвотны зможа свабодна яго ўбачыць. Побач з поясам размесцяцца рэпрадукцыі карцін з выявамі шляхціцаў, вопратку якіх упрыгожваюць слуцкія паясы. Будуць і фотаздымкі, на якіх можна ўбачыць, як і хто насіў гэты элемент гардэроба. Таксама будуць фота нядаўняга часу, прысвечаныя экспанаванню іншых паясоў у музеі.

Варта адзначыць, што ў Слуцку ёсць прадпрыемства «Слуцкія паясы», у якім зусім нядаўна зрабілі новы музей слуцкага пояса. Акрамя іх там можна ўбачыць станок для ткання паясоў, набыты ў Германіі. Нагадаем, што тэхналогію, па якой будуць вырабляцца паясы — сапраўдны брэнд краіны, распрацавалі ў Віцебскім тэхналагічным універсітэце («Звязда» пісала пра гэта 18 верасня 2012 года). Тут жа можна будзе набыць і новаствораны сувенірны слуцкі пояс.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

г. Слуцк

Будынак Слуцкага краязнаўчага музея.

■ 100 славутых прозвішчаў Беларусі

ТАРАШКЕВІЧЫ

Браніслаў Тарашкевіч — аўтар першай «Беларускай граматыкі для школ»

Многія з нас чулі або самі выкарыстоўвалі слова «тарашкевіца». Звычайна гэтым словам называецца адзін з варыянтаў беларускай арфаграфіі, які існаваў да правапіснай рэформы 1933 года. Слова «тарашкевіца» ўтворана ад прозвішча выдатнага грамадскага і палітычнага дзеяча, асветніка, вучонага-мовазнаўцы, пісьменніка, публіцыста і перакладчыка Браніслава Адамавіча Тарашкевіча. Браніслаў Тарашкевіч адносіцца да ліку інтэлігентаў пачатку XX стагоддзя, якія прысвяцілі ўсё сваё жыццё ідэі нацыянальнага адраджэння беларускага народа, яго мовы, гісторыі і культуры.

Нарадзіўся Тарашкевіч 8 (20) студзеня 1899 года ў засценку Мацюлішкі, недалёка ад Вільні, у сялянскай сям'і. Бацькі не мелі магчымасці вучыць сына, але імкненне юнага Браніслава да ведаў дазволіла яму, адзінаму з усіх дзяцей сям'і, атрымаць адукацыю. Спачатку ён вучыўся ў Віленскай гімназіі, затым на гісторыка-філалагічным факультэце Петраградскага ўніверсітэта, дзе і застаўся працаваць.

У 1918 годзе падрыхтаваў і выдаў у Вільні ў друкарні Марціна Кухты першы падручнік для школьнікаў «Беларуская граматыка для школаў». Граматыка была апублікавана дзвюма графікамі — лацінкай і кірыліцай. Выданне «Беларускай граматыкі» стала сапраўднай падзеяй у гісторыі беларускага мовазнаўства: яно адкрыла новую эпоху ў развіцці беларускай літаратурнай мовы. У кнізе аўтар абагульніў, сістэматызаваў і замацаваў беларускамоўныя пісьмовыя традыцыі, якія склаліся да гэтага часу, улічыў лінгвістычны вопыт папярэднікаў, у першую чаргу сваіх настаўнікаў — А. Шахматава і Я. Карскага. Усё гэта садзейнічала станаўленню нормаў літаратурнай мовы. Прайшло амаль сто гадоў, а правілы, сфармуляваныя Браніславам Тарашкевічам, застаюцца актуальнымі да нашых дзён. Больш за тое, некаторыя публіцыстычныя выданні і асобныя творцы і сёння карыстаюцца нормамі, адлюстраванымі ў «Беларускай граматыцы для школаў» Браніслава Тарашкевіча.

У 1921–1922 гадах ён працаваў выкладчыкам і дырэктарам Віленскай беларускай гімназіі ў Мінску. Сотні юных беларусаў мелі шчасце слухаць лекцыі па беларускай мове і літаратуры, якія ім чытаў слынны вучоны. У гэты ж час Тарашкевіч стаў адным з заснавальнікаў Таварыства беларускай школы, якое налічвала больш за 30 тысяч чалавек. Таварыства адыграла выключную ролю ў пашырэнні беларускамоўнай асветы на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Таварыства беларускай школы вяло сапраўдную барацьбу з польскімі афіцыйнымі ўладамі за арганізацыю і існаванне беларускіх школ, за дэмакратызацыю адукацыі, арганізацыю нацыянальных выдавецкіх цэнтраў. Натхняльнікам самых розных мерапрыемстваў Таварыства выступаў сам Тарашкевіч.

У гэты ж час гэты аўтарытэтны вучоны і грамадскі дзеяч пачынае актыўна займацца палітыкай. У 1922 годзе ён абраны паслом (дэпутатам) польскага сейма, а ў 1922–1924 гадах з'яўляўся старшынёй Беларускага пасольскага клуба. З трыбуны сейма пастаянна выступаў у абарону сацыяльных і нацыянальных правоў беларусаў на тэрыторыі Польшчы, адстойваў права землякоў на навучанне на роднай мове. У 1925 годзе заснаваў Беларускую сялянска-работніцкую грамаду, а пазней стаў членам Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. У 1927 годзе быў асуджаны польскімі ўладамі на 12 гадоў турмы. Падставай для арышту была названа спроба дзяржаўнага перавароту з мэтай далучэння Заходняй Беларусі да Савецкага Саюза.

Знаходзячыся ў зняволенні, Тарашкевіч не пакідаў творчую работу: ён працаваў над падрыхтоўкай гістарычнай граматыкі беларускай мовы, пераклаў на беларускую мову паэмы «Іліяда» Гамэра і «Пан Тадэвуш» Адама Міцкевіча. Падчас зняволення ён быў абраны акадэмікам толькі што створанай у Мінску Беларускай акадэміі навук.

Праз два гады спецыяльным распараджэннем Прэзідэнта Польшчы быў вызвалены. Пазней, у 1931 годзе, Браніслаў Тарашкевіч зноў быў арыштаваны і асуджаны на 8 гадоў катаржнай турмы.

У 1933 годзе ў выніку дамовы паміж Польшчай і СССР адбыўся абмен двума знакавымі палітвязнямі — палітыкам і вучоным, вязнем польскіх астрогаў Браніславам Тарашкевічам і драматургам, акцёрам і рэжысёрам Францішкам Аляхновічам, вязнем савецкага канцлагера. Па сведчанні вядомага даследчыка жыцця і творчасці Браніслава Тарашкевіча прафесара Арсеня Ліса, Мінск вітаў Тарашкевіча як трыумфатара, героя, рэвалюцыянера. Ён атрымаў пасаду намесніка загадчыка польскага аддзела ў Міжнародным аграрным інстытуце ў Маскве. Аднак савецкай уладзе не патрэбны былі адукаваныя інтэлігентныя нацыянальна арыентаваныя людзі. У 1937 годзе ў выніку сталінскіх рэпрэсій фактычна была вынішчана творчая інтэлігенцыя Беларусі. Не абмінуў трагічны лёс і Браніслава Тарашкевіча. 6 мая 1937 года ён быў арыштаваны па справе так званага «Беларускага нацыянальнага цэнтра». 5 студзеня 1938 года выдатны дзеяч беларускага народа Браніслаў Тарашкевіч быў асуджаны «двойкай» (камісіяй НКУС СССР і пракурорам СССР) да найвышэйшай меры пакарання. 29 лістапада 1938 года прысуд быў прыведзены ў выкананне: Браніслаў Тарашкевіч быў расстраляны. Праз 19 гадоў Тарашкевіч быў рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР у сувязі з адсутнасцю складу злачынства.

У Беларусі імя Браніслава Тарашкевіча ўшанавана ў назвах вуліц у горадзе Мінску, Маладзечне і гарадскім пасёлку Радашковічы Маладзечанскага раёна. З 1969 года імя Тарашкевіча носіць ліцэй з беларускай мовай навучання ў польскім горадзе Бельск-Падляскі.

Ігар КАПЫЛОЎ.

ПАХОДЖАННЕ ПРОЗВІШЧА І СУЧАСНЫЯ ТАРАШКЕВІЧЫ

Прозвішча Тарашкевіч паходзіць ад народнай формы Тараска (варыянт Тарашка), утворанай ад хрысціянскага імя Тарас (у старажытнагрэчаскай мове абазначала «бунтар»). На тэрыторыі сучаснай Беларусі прозвішча Тарашкевіч сустракаецца толькі ў некалькіх рэгіёнах: Полацкі раён (Віцебская вобласць), Астравецкі, Воранаўскі, Іўеўскі, Шчучынскі раёны (Гродзенская вобласць), Дзяржынскі, Пухавіцкі раёны (Мінская вобласць).